# КАНТРАКТАЎ — НЕ МЕНШ ЧЫМ НА $300 млн



Адначасова з Форумам рэгіёнаў адкрыўся Беларускі аграпрамысловы тыдзень. Удзельнікі форуму наведалі выставу «Белагра-2016».

Фота БЕЛТА.

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Валянціна Мацвіенка падзякавала беларускім калегам за арганізацыю Форуму і за тое, што на ім створаны добрыя ўмовы для працы.

— Кантакты па парламенцкай лініі арганічна дапаўняюць дыялогі на высокім, найвышэйшым узроўнях, — паведаміла яна. — Расійскі бок задаволены тэмпамі развіцця двухбаковага стратэгічнага партнёрства, фарміравання Саюзнай дзяржавы.

Старшыня Савета Федэрацыі падкрэсліла, што лідары дзвюх краін рэгулярна сустракаюцца асабіста, праводзяць тэлефонныя нарады. Актыўна ўзаемадзейнічаюць урады і прэм'ер-міністры, супрацоўнічаюць знешнепалітычныя ведамствы.

Што тычыцца парламенцкіх структур, то яны, па словах спікера верхняй палаты расійскага парламента, сумесна працуюць «як на двухбаковым узроўні, так і ў рамках Саюзнай дзяржавы, дзе ёсць магчымасць абменьвацца вопытам заканатворчай работы, весці работу па далейшай гарманізацыі заканадаўстваў і ствараць заканадаўча-прававыя ўмовы для рэалізацыі дамоўленасцяў, якія дасягаюцца на найвышэйшым і высокім узроўнях».

— Міжрэгіянальныя сувязі сталі канстантай двухбаковых сувязяў, — падкрэсліла Валянціна Мацвіенка. — Міжрэгіянальнае супрацоўніцтва дае рэальныя вынікі ў розных сферах, значыць, гэты фармат вельмі запатрабаваны.

## МЫ ЗА ШМАТБАКОВАЕ СУПРАЦОЎНІЦТВА

Міхаіл Мясніковіч, адказваючы на пытанне прадстаўніка аднаго з расійскіх СМІ пра тое, ці не пашкодзяць беларуска-расійскаму стратэгічнаму супрацоўніцтву актыўныя кантакты нашай краіны з Еўрасаюзам, падкрэсліў, што неабходна атрымліваць выгаду са шматбаковага супрацоўніцтва.

— Мы выбудоўваем нармальныя паважлівыя адносіны і з іншымі краінамі, і гэта зусім не азначае, што яны павінны быць на шкоду Расіі, — заявіў старшыня Савета Рэспублікі. — Мы таксама з павагай ставімся да рашэнняў, якія прымаюцца Расіяй па супрацоўніцтве з трэцімі краінамі.

У сваю чаргу Валянціна Мацвіенка адзначыла, што ні Расія, ні Беларусь не імкнуцца да самаізаляцыі і гатовыя да ўзаемавыгаднага супрацоўніцтва з іншымі інтэграцыйнымі аб'яднаннямі і дзяржавамі на раўнапраўных умовах, з улікам інтарэсаў адзін аднаго.

Падчас размовы з журналістамі Валянціна Мацвіенка, адказваючы на пытанне пра прыярытэты супрацоўніцтва Беларусі і Расіі ў няпросты ў эканамічным плане час, зрабіла акцэнт на тым, што скаардынаваныя дзеянні нашых краін па развіцці эканомікі, прамысловасці, сельскай гаспадаркі змякчылі наступствы негатыўных сусветных эканамічных тэндэнцый.

— Нягледзячы на існуючыя цяжкасці, аб'ёмы ўзаемнага гандлю паміж нашымі краінамі не знізіліся, а па шэрагу паказчыкаў нават выраслі, — прывяла прыклад яна. — Мы не кажам пра цэнавыя паказчыкі. Важна, што фактычныя аб'ёмы ўзаемнага тавараабароту захаваліся.

Што да саміх прыярытэтаў, то, па словах Валянціны Мацвіенкі, іх цэлы шэраг, які вызначаны лідарамі абедзвюх краін.

— Натуральна, гэта далейшае развіццё эканамічнага, інвестыцыйнага супрацоўніцтва. На сёння ў Беларусі працуе амаль дзве з паловай тысячы прадпрыемстваў з удзелам расійскага капіталу, з іх 1,5 тысячы — гэта сумесныя прадпрыемствы, каля тысячы — прадпрыемствы са 100%-ным расійскім капіталам. Але поле магчымасцяў тут далёка не вычарпана.

## НА ШЛЯХУ ДА БЕЗБАР'ЕРНАГА РЫНКУ

**Анатоль РУСЕЦКІ, намеснік старшыні верхняй палаты беларускага парламента**, падчас трэцяга пасяджэння міжпарламенцкай камісіі Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу і Савета Федэрацыі Федэральнага сходу па міжрэгіянальным супрацоўніцтве заявіў, што форум ужо даказаў сваю жыццяздольнасць.

— Супрацоўніцтва паміж нашымі рэгіёнамі стала напаўняць канкрэтным зместам увесь працэс развіцця Саюзнай дзяржавы, — адзначыў ён. — Разгляд практычных пытанняў супрацоўніцтва з прыцягненнем рэгіёнаў, суб'ектаў гаспадарання дазваляе здзяйсняць свайго роду маніторынг і выяўляць праблемы, што ўзнікаюць падчас рэалізацыі рашэнняў, якія прымаюцца ў інтэграцыйных аб'яднаннях.

У той жа час віцэ-спікер Савета Рэспублікі прызнаў, што ёсць у рамках беларуска-расійскага супрацоўніцтва і праблемныя пытанні.

— На жаль, мы пакуль не можам быць цалкам задаволенымі вынікамі нашай дзейнасці. Безумоўна, сур'ёзны ўплыў на гэта аказваюць і знешнія фактары, але і нам, відаць, неабходна больш выразна і канкрэтна вырашаць узнікаючыя праблемы. Дагэтуль захоўваюцца і бар'еры, і перашкоды ва ўзаемным гандлі. Спадзяюся, што мы сумеснымі намаганнямі створым агульны рынак без выняткаў і абмежаванняў. Галоўнае, што дынаміка станоўчая з абодвух бакоў нашай «двойкі».

Анатоль Русецкі звярнуў асобную ўвагу на неабходнасць інфармацыйнай падтрымкі тых інтэграцыйных працэсаў, што адбываюцца ў рамках Саюзнай дзяржавы. Па яго словах, яна павінна здзяйсняцца не толькі саюзнымі сродкамі масавай інфармацыі, але і іншымі.

**Юрый ВАРАБ'ЁЎ, намеснік старшыні Савета Федэрацыі Федэральнага сходу Расіі**, адзначыў, што ўжо час разгледзець прапановы, звязаныя з парадкам дня наступнага Форуму рэгіёнаў і парадкам дня чацвёртага пасяджэння міжпарламенцкай камісіі Савета Рэспублікі і Савета Федэрацыі.

— Дзейнасць нашай міжпарламенцкай камісіі ў рамках Форуму надае яму больш канкрэтыкі, — лічыць ён. — Для нас вельмі важна, каб рэгіянальнае супрацоўніцтва нашых дзяржаў складвалася ў практычнай сферы, каб мы атрымлівалі вынікі ад гэтага супрацоўніцтва.

* * *

Першы дзень Форуму быў насычаны самымі рознымі мерапрыемствамі. Гэта і пасяджэнні секцый па самых розных пытаннях — пачынаючы ад беларуска-расійскага супрацоўніцтва ў сферы працоўных адносін і сацыяльнай абароны і заканчваючы ўзаемадзеяннем у турыстычнай сферы. Падчас Форуму праходзяць і спецыялізаваныя мерапрыемствы, у тым ліку 26-я спецыялізаваная выстава «БЕЛАГРА-2016», Фестываль рэгіянальных тэлеканалаў Беларусі і Расіі «Вобраз часу», другі этап Спартакіяды Саюзнай дзяржавы для дзяцей і юнацтва, марафон дзіцячай творчасці «Дзве краіны — адзін лёс», маладзёжны форум IT-youth, шэраг міжнародных канферэнцый, семінараў, круглых сталоў. Дэлегаты Форуму прымаюць удзел і ў мерапрыемствах Дзён Масквы ў Мінску, што праходзяць зараз у нашай сталіцы.

**Надзея ЮШКЕВІЧ.** *yushkevich@zviazda.by*

# ІНТЭГРАЦЫЙНЫЯ СУВЯЗІ

## Сёння ў іх стварэнні значную ролю адыгрываюць СМІ

**У межах трэцяга Форуму рэгіёнаў Беларусі і Расіі ў Інстытуце журналістыкі Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта працавала секцыя «СМІ як значны фактар міжрэгіянальнага ўзаемадзеяння, фарміравання агульнай прасторы гуманітарных каштоўнасцяў».**

— Галоўная задача Форуму рэгіёнаў Беларусі і Расіі, якая была сфармулявана ў гэтым годзе, — сацыяльная праблематыка, — гаворыць **міністр інфармацыі Беларусі Лілія АНАНІЧ**. — Гэта тое, што выходзіць на канкрэтнага чалавека: роўныя правы грамадзян на працу, адукацыю, ахову здароўя. І ўсё гэта ў Саюзнай дзяржаве дынамічна развіваецца.

На думку міністра, сёння менавіта рэгіянальныя СМІ могуць найбольш удала адыграць ролю праваднiка інтэграцыйных працэсаў Саюзнай дзяржавы Беларусі і Расіі. «Яны бліжэй да людзей, да той праблематыкі, якая тычыцца кожнага канкрэтнага чалавека. А аб'яднаўшы намаганні ўсёй інфармацыйнай прасторы Беларусі і Расіі, мы зможам магутна трансліраваць ідэі Саюзнай дзяржавы на сусветным інфармацыйным полі», — лічыць Лілія Ананіч.

**Людміла БОКАВА, намеснік старшыні камітэта Савета Федэрацыі Федэральнага сходу Расійскай Федэрацыі па канстытуцыйным заканадаўстве і дзяржаўным будаўніцтве**, упэўнена, што форум — найбольш удалы фармат для абмеркавання інтэграцыйных працэсаў. «Больш чым 30 інфармацыйных праектаў цяпер рэалізуецца паміж Рэспублікай Беларусь і суб'ектамі Расійскай Федэрацыі. Гэта добры паказчык і ў той жа час наша агульнае дасягненне. Асноўны лейтматыў сённяшняй сустрэчы — гэта стварэнне адзінай інфармацыйнай прасторы. Тым больш, зараз у нас ёсць цікавае судакрананне: у Расіі гэты год аб'яўлены годам кіно, у Беларусі — культуры», — паведаміла Людміла Бокава.

**Аляксандр ВАРФАЛАМЕЕЎ, член Савета Федэрацыі ад заканадаўчага (прадстаўнічага) органа дзяржаўнай улады Рэспублікі Бурацiя**, лічыць, што цікавасць да секцыі нездарма праявіла вялікая колькасць расійскіх рэгіянальных тэлерадыёкампаній з Расійскай Федэрацыі нездарма. «Гэта пацвярджае, што правядзенне Форуму — справа значная і актуальная. Сёння СМІ — галоўныя сувязныя ўжо не ніці, а надзейныя ланцужкі на высокім дзяржаўным узроўні», — мяркуе Аляксандр Варфаламееў.

**Дырэктар — галоўны рэдактар Выдавецкага дома «Звязда» Алесь КАРЛЮКЕВІЧ** прысвяціў сваё выступленне саюзнаму супрацоўніцтву ў сферы літаратуры. «Значную ролю ў выкладанні інфармацыі аб падзеях, якія тычацца грамадскай, сацыяльнай, палітычнай сфер нашага жыцця, адыгрывае мастацкая літаратура. Мы — невялікая краіна. Але тая мастацкая прастора, тыя культурныя парадыгмы, якія генерыруюць мастакі слова Беларусі, ствараліся на працягу не аднаго дзесяцігоддзя і маюць адметнасць і каштоўнасць», — лічыць Алесь Карлюкевіч. Па яго словах, сёння паміж Беларуссю і Расіяй існуе шмат сумесных літаратурных праектаў, выдаюцца кнігі расійскіх аўтараў у перакладзе на беларускую мову. І праектаў з кожным годам становіцца больш.

**Вераніка ПУСТАВІТ.** *pustavit@zviazda.by*

# ЯКІ ЁН, ВОБРАЗ ЧАСУ?

## Фестываль рэгіянальных тэлекампаній Беларусі і Расіі працуе ў Мінску

**Расійскія тэлеканалы стала «прапісаліся» ў эфірнай прасторы Беларусі. Вяшчае па спадарожніку і тэлеканал «Беларусь-24». Але так атрымалася, што з-за аб'ёмнага асвятлення жыцця палітычных і эканамічных цэнтраў абедзвюх краін паказ рэгіёнаў Беларусі ў расійскім эфіры і наадварот адышоў на другі план. Тыя, хто жыве ў памежных раёнах, яшчэ могуць глядзець рэгіянальныя тэлеканалы суседняй краіны. А як быць тым, хто знаходзіцца далёка ад рэтранслятараў, якія даюць гэтую магчымасць?**

Менавіта тэме супрацоўніцтва рэгіянальных тэлеканалаў абедзвюх краін у творчым, культурным і асветніцкім складніках і прысвечаны Першы фестываль рэгіянальных тэлекампаній Беларусі і Расіі «Вобраз часу». А кампаніі, дзе выйшлі найлепшыя сюжэты, атрымалі дыпломы.

— Першы фестываль рэгіянальных тэлекампаній Расіі і Беларусі «Вобраз часу», ініцыяваны Міністэрствам інфармацыі, знайшоў жывы водгук у абедзвюх краінах, — сказала **міністр інфармацыі Лілія АНАНІЧ**. — Ён падтрыманы Саветам Рэспублікі Нацыянальнага сходу, Міністэрствам замежных спраў, Пастаянным камітэтам Саюзнай Дзяржавы. Для нас самае галоўнае, каб маштабнае супрацоўніцтва з расійскімі рэгіёнамі знаходзіла сваё адлюстраванне ў эфіры рэгіянальных тэлеканалаў. Мы разлічваем, што гэты праект не застанецца пілотным і будзем штогод прырастаць якасным кантэнтам. Можна сказаць, што ў нас з'яўляецца яшчэ адна прафесійная творчая пляцоўка, дзе супрацоўнікі тэлеканалаў Расіі і Беларусі будуць спаборнічаць у лепшых праектах.

Удзельнікамі мерапрыемстваў фестывалю сталі прадстаўнікі 27 тэлекампаній з рэгіёнаў Беларусі і Расіі: Гомельскай, Магілёўскай, Мінскай, Брэсцкай, Віцебскай, Гродзенскай, Калінінградскай, Кастрамской, Ленінградскай, Бранскай, Уладзімірскай і Іркуцкай абласцей, гарадоў Сочы і Санкт-Пецярбурга, а таксама Чачэнскай Рэспублікі і Ямала-Ненецкай аўтаномнай акругі. Усяго ж тэлекампаніі прадставілі на суд журы каля 50 праектаў. Дыпломы 1 ступені на дэбютным фестывалі заваявалі дзве арганізацыі. Гэта абласная тэлерадыёкампанія «Русь» з Кастрамской вобласці Расіі і Лідскае тэлерадыёаб'яднанне з Гродзенскай вобласці Беларусі.

— Нашы супрацоўнікі ездзілі ў Крымск — горад у Краснадарскім краі Расіі, — гаворыць **галоўны рэдактар Лідскага тэлерадыёаб'яднання Ніна ПАЗНЯК**. — Матэрыял-прызёр прысвечаны дапамозе беларусаў у ліквідацыі наступстваў разбуральнай паводкі ў Крымску ў 2012 годзе.

Як адзначыў на цырымоніі ўзнагароджання старшыня Тэлерадыёвяшчальнай арганізацыі Саюзнай дзяржавы Ігар Угольнікаў, рэгіянальнаму вяшчанню дадзены старт:

— На нашым тэлеканале прайшоў дзень Уфы, пасля яго зменяць Астрахань і Магілёў. Дзень 22 чэрвеня будзе прысвечаны Брэсту. Пакажам сюжэты і з Грознага, са Смаленска... Для таго і працуе Саюзнае тэлебачанне, каб паказваць шырокаму гледачу жыццё рэгіёнаў Расіі і Беларусі.

**Дзяржаўны сакратар Саюзнай дзяржавы Рыгор РАПОТА** ў сваю чаргу падзяліўся развагамі наконт важнасці такога супрацоўніцтва:

— Часта сцвярджаюць, што трэба адраджаць патрыятызм. Але ён праяўляецца ў любові да таго месца, дзе ты жывеш, да сям'і, да бацькоў, прыроды, гісторыі. І ўсё гэта ёсць і ў беларусаў, і ў расіян. Мабыць, гэта якраз і ёсць вышэйшая місія журналістыкі — абудзіць цікавасць да сваёй жа краіны.

Праграмай фестывалю прадугледжаны ўдзел журналістаў абедзвюх краін у ІІІ Форуме рэгіёнаў Беларусі і Расіі, правядзенне творчых тэлемайстэрняў, стварэнне рэпартажаў з месца падзей. Напярэдадні госці наведалі Беларускі дзяржаўны музей гісторыі Вялікай Айчыннай вайны, а таксама Белтэлерадыёкампанію. Ва ўнікальнай на прасторах СНД студыі «600 метраў» яны пазнаёміліся з дзейнасцю медыяхолдынга.

— Нашы расійскія калегі цікавіліся рэкламай на тэлебачанні, папулярнымі праграмамі, культурным складнікам, — паведаміў карэспандэнту «Звязды» **генеральны прадзюсар Белтэлерадыёкампаніі Кірыл КАЗАКОЎ**. — Абласным тэлерадыёкампаніям паступілі прапановы аб супрацоўніцтве. Канешне, тут трэба ўлічваць, якія менавіта перадачы аб жыцці, напрыклад, Магілёўшчыны, будуць цікавыя гледачам, скажам, Курскай вобласці. Разам з тым выбраны ўжо пэўны кантэнт для відэатэк.

**Валяр'ян ШКЛЕННІК.** *schklennik@zviazda.by*

# АСАБЛІВАЯ МІСІЯ

**Удзельнікі XVI сесіі Савета кіраўнікоў вышэйшых органаў фінансавага кантролю дзяржаў — удзельніц СНД прытрымліваюцца таго пункту гледжання, што сёння асаблівая місія ў пытаннях забеспячэння эканамічнай бяспекі адводзіцца вышэйшым органам фінансавага кантролю. Дэталёвы аўдыт і кантроль, якія імі праводзяцца, накіраваны не толькі на выяўленне «болевых» кропак у эканоміцы і сацыяльнай сферы, але і на выпрацоўку прапаноў па выпраўленні сітуацыі, у тым ліку на заканадаўчым узроўні.**

— За 16 гадоў свайго існавання Савет зарэкамендаваў сябе са станоўчага боку, — адзначыў **Леанід АНФІМАЎ, старшыня Камітэта дзяржаўнага кантролю нашай краіны**. — Ні ў каго з кіраўнікоў дзяржаў СНД не ўзнікла сумненняў наконт неабходнасці гэтага органа. Фактычна, ён стварыўся жыццём, быў запатрабаваны аб'ектыўнымі ўмовамі і прадпасылкамі, якія складаліся ў нацыянальных эканоміках нашых краін.

Па словах Леаніда Анфімава, Савет аказвае падтрымку кіраўнікам краін — удзельніц СНД у тым, што тычыцца паглыблення інтэграцыйных працэсаў, якія адбываюцца на постсавецкай прасторы.

Акрамя таго, яшчэ адна не менш важная мэта Савета, па словах старшыні КДК, — наладзіць цеснае ўзаемадзеянне па лініі органаў фінансавага кантролю ў адпаведнасці са спецыфічнасцю выконваемых імі прафесійных задач на тэрыторыях дзяржаў Садружнасці.

— Трэба, каб праз супрацоўніцтва паміж нашымі органамі мы змаглі наладзіць цеснае ўзаемадзеянне на шляху вырашэння праблемных пытанняў, якія ўзнікаюць у нацыянальных эканоміках, — заявіў Леанід Анфімаў.

Сесія завяршылася падпісаннем выніковых дакументаў.

**Надзея ЮШКЕВІЧ.** *yushkevich@zviazda.by*

НАВІНЫ ПАДЗЕІ ФАКТЫ

## ЗАЯВЫ НА ПРЫВАТЫЗАЦЫЮ ПРЫМАЮЦЦА ДА 1 ЛІПЕНЯ

**Менавіта да гэтага дня, у адпаведнасці з Указам кіраўніка дзяржавы ад 16 снежня 2013 года № 563 «Аб некаторых пытаннях прававога рэгулявання жыллёвых адносін», грамадзяне маюць права звярнуцца з заявай аб прыватызацыі займаемага імі жылля.**

Улічваючы, што да названай даты застаецца менш за месяц, Дзяржкаммаёмасць з мэтай папярэджання ўзнікнення пытанняў пры рэалізацыі грамадзянамі сваіх правоў на прыватызацыю жылых памяшканняў дадаткова звяртае ўвагу на агульныя падыходы да вызначэння кошту жылых памяшканняў дзяржаўнага жыллёвага фонду для мэт іх прыватызацыі ў нашай краіне.

Для дадатковага інфармавання насельніцтва Дзяржаўны камітэт па маёмасці 11, 18 і 25 чэрвеня арганізуе спецыяльныя «прамыя тэлефонныя лініі» па пытаннях вызначэння кошту жылых памяшканняў для прыватызацыі. Паводле інфармацыі прэс-службы камітэта 11 і 18 чэрвеня з 9.00 да 12.00 гадзін на пытанні грамадзян адкажа **начальнік упраўлення ацэнкі Дзяржкаммаёмасці Дзіна Міхайлаўна САКАЛОЎСКАЯ**, кантактны тэлефон: (017) 288-12-26. А 25 чэрвеня з 9.00 да 12.00 гадзін на пытанні грамадзян адкажа **намеснік начальніка ўпраўлення ацэнкі Дзяржкаммаёмасці Вячаслаў Валер'евіч БЕЛАВУСАЎ**, кантактны тэлефон: (017) 233-96-74.

**Сяргей КУРКАЧ.** *kurkach@zviazda.by*

## КАВЯРНІ НЕ ПАВІННЫ ДЫКТАВАЦЬ УМОВЫ

**Міністэрства гандлю правяло маніторынг парадку прыёму (афармлення) папярэдніх заказаў на абслугоўванне ў аб'ектах грамадскага харчавання.**

Падчас яго выяўлена, што некаторымі такімі суб'ектамі ўстанаўліваецца мінімальная сума перадаплаты пры заказе, а таксама мінімальная сума заказу на аднаго чалавека як пры правядзенні вяселляў, юбілеяў, так і пры арганізацыі мерапрыемстваў для выпускнікоў. У міністэрстве нагадалі суб'ектам грамадскага харчавання аб недапушчальнасці такога кроку: незахаванне патрабаванняў пастановы Мінгандлю ад 29 лютага 2008 года №7 «Аб парадку афармлення папярэдніх заказаў на абслугоўванне, аказанне паслугі ў аб'ектах грамадскага харчавання» можа пацягнуць для фізічнай ці юрыдычнай асобы адміністрацыйную адказнасць.

**Сяргей РАСОЛЬКА.** *rs@zviazda.by*

## ГЕРОІ «ЧЫРВОНКІ» — НАЙЛЕПШЫЯ Ў СВЕЦЕ


Фота Надзеі БУЖАН.

**Маладая беларуская артыстка перамагла на конкурсе цыркавога мастацтва ў Кіеве.**

20-гадовая студэнтка хімічнага факультэта Белдзяржуніверсітэта Алена Клімовіч, пра якую зусім нядаўна пісала «Чырвонка. Чырвоная змена», днямі заваявала залаты медаль на І Міжнародным дзіцячым і маладзёжным фестывалі цыркавога мастацтва ў сталіцы Украіны. Нумар беларускай цыркачкі пад назвай «Антыпод «Іншая» назвалі найлепшым у катэгорыі ад 18 да 25 гадоў. Сапернікамі дзяўчыны былі больш як паўсотні талентаў з розных краін.

Усяго ў фестывалі ўзялі ўдзел каля 200 маладых артыстаў з Украіны, Беларусі, Ізраіля, Егіпта, Латвіі. Для паветранай гімнасткі, якая паспявае вучыцца і працаваць у Белдзяржцырку, гэта ўжо трэцяя буйная ўзнагарода за апошні час. Днямі Алена Клімовіч стала яшчэ і стыпендыяткай Спецыяльнага фонду Прэзідэнта па падтрымцы таленавітай моладзі.

Убачыць пераможны нумар у выкананні артысткі на свае вочы можна ўжо цяпер — ён уключаны ў праграму «Я працую чараўніком», якая будзе дэманстравацца ў Белдзяржцырку да 24 ліпеня.

**Яраслаў ЛЫСКАВЕЦ.** *lyskavets@zviazda.by*

## «БМВ» УДАРЫЎСЯ Ў ДРЭВА

**Міліцыя высвятляе месцазнаходжанне вадзіцеля аўтамабіля «БМВ», які ўрэзаўся ў дрэва, пасля чаго пакінуў месца дарожна-транспартнага здарэння.**

Гэты выпадак адбыўся ў сталіцы на скрыжаванні вуліц Бельскага і Адоеўскага. Згодна з папярэдняй інфармацыяй, легкавы аўтамабіль ўрэзаўся ў дрэва на вялікай хуткасці. Пасля таго кіроўца і пасажыр пакінулі месца аварыі. Асоба першага ўжо ўстаноўлена, супрацоўнікі міліцыі высвятляюць яго месцазнаходжанне і абставіны здарэння.

У гэты ж дзень у Мінску адбылося яшчэ адно ДТЗ, у якім легкавік «Міцубісі» сутыкнуўся з нерухомым прадметам. На развязцы праспектаў Жукава і Дзяржынскага яго кіроўца выехаў за межы праезнай часткі і ўдарыўся ў бетонную асвятляльную мачту. Па інфармацыі УДАІ УУС Мінгарвыканкама, кіроўцу раптоўна стала дрэнна за рулём.

## ШТО ВЫПІЛІ, УСТАНОВІЦЬ ЭКСПЕРТЫЗА

**Тры чалавекі памерлі ў Карэліцкім раёне пасля ўжывання невядомай спіртавой вадкасці.**

Па інфармацыі прэс-службы УУС Гродзенскага аблвыканкама, траіх жыхароў вёскі Некрашэвічы знайшлі ўжо мёртвымі. Высветлена, што напярэдадні ў госці да двух аднавяскоўцаў прыйшла жанчына, якая прынесла з сабой паўтаралітровую пластыкавую ёмістасць з вадкасцю, якая змяшчала спірт. Кампанія распіла яе, і праз некалькі гадзін пасля гэтага ўсе трое сканалі. Паходжанне вадкасці пакуль невядомае, прызначана судова-хімічная экспертыза. Па факце прычынення смерці па неасцярожнасці дзвюм і больш асобам заведзена крымінальная справа.

**Сяргей РАСОЛЬКА.** *rs@zviazda.by*

# «Менавіта адноўленыя помнікі запатрабаваныя беларусамі»

## За апошнія пяць гадоў другое жыццё атрымалі многія аб'екты духоўна-культурнай спадчыны

**Нягледзячы на не самы просты час, у нашай краіне вядуцца аднаўленчыя работы на аб'ектах гісторыка-культурнай спадчыны, якія вымагаюць, натуральна, досыць значнага фінансавання. За апошнія пяць гадоў адноўлены многія знакавыя помнікі — напрыклад, сядзіба ў Лошыцкім парку ў Мінску, палац Друцкіх-Любецкіх у Шчучыне і многае іншае. Адрэстаўраваныя каштоўнасці цяпер можна ўбачыць разам у адным месцы — іх фотаздымкі прадстаўлены ў адмысловым праекце, размешчаным на агароджы сталічнага парку Чалюскінцаў. Выставу «Спадчына Беларусі. Адноўленыя архітэктурныя каштоўнасці» прадставілі фотамастакі Алег Лукашэвіч і Аляксандр Аляксееў сумесна з арт-цэнтрам Вольгі і Андрэя Смалякоў.**

**Галоўны спецыяліст Галоўнага ўпраўлення ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі Мінскага гарвыканкама Марыя ЯСЮК,** якая прысутнічала на адкрыцці выставы, заўважыла:

— Сёлетні праект, што размяшчаецца на гістарычнай агароджы парку Чалюскінцаў, — ужо пяты па ліку. Тры з іх называліся «Спадчына Беларусі». У 2014 годзе мінчукі і госці сталіцы змаглі пазнаёміцца з замкамі, цэрквамі, саборамі, якія захавала шматпакутная Беларусь. У 2015 годзе аўтары праекта дапамаглі пазнаёміцца з чатырма аб'ектамі, што былі ўнесены ў спіс гістарычнай спадчыны ЮНЕСКА. А сёлета мы бачым адноўленыя каштоўнасці Беларусі. Гэта не проста адукацыйны праект, які ўпрыгожвае сталіцу. Ён адлюстроўвае нашу духоўнасць, сувязь пакаленняў. А таксама гэта яскравы прыклад дзяржаўна-прыватнага партнёрства.

З 2004 па 2016 год выдадзена і рэалізавана 44 500 экзэмпляраў альбома «Спадчына Беларусі». З 2003 па 2015 год аўтарамі праведзена больш за 20 рэспубліканскіх і міжнародных выстаў, мэтай якіх было прадстаўленне гісторыка-культурнага багацця нашай краіны.

**Пятнаццаць гадоў таму не было ні ратушы ў Магілёве, ні ратушы ў Мінску, ні многіх іншых аб'ектаў.**

**Старшыня Саюза мастакоў Беларусі Рыгор СІТНІЦА**, ацэньваючы багатую архітэктурную спадчыну, якую мы маем, вырашыў звярнуцца да слоў класіка:

— Хачу працытаваць верш Янкі Купалы: «І ў белы дзень, і ў чорну ноч, я ўсцяжераблю агледзіны. Ці гэты скарб не збрыў дзе проч? Ці трутнем ён не з'едзены?..»


Выстава «Спадчына Беларусі. Адноўленыя архітэктурныя каштоўнасці» размешчана на агароджы сталічнага парку Чалюскінцаў.

Выстава фотаздымкаў нацыянальных каштоўнасцяў скіравана на тое, каб нацыянальны скарб нікуды «не збрыў», каб не быў забыты сучаснікамі. Тое, што робяць Аляксандр Аляксееў і Алег Лукашэвіч — гэта вялікая справа, якая накіравана на захаванне і папулярызацыю беларускай адметнасці. Наша нацыя старадаўняя, мы ідзём ад Рагвалода, ад караля Міндоўга, ад Францыска Скарыны і Еўфрасінні Полацкай. Нам тысяча гадоў, і трэба памятаць пра гэта. Але каб ганарыцца, варта памятаць сваю гісторыю, праўдзівую, багатую, еўрапейскую. Нам трэба стаць не проста геаграфічным, але і духоўным цэнтрам Еўропы!

Арыгінальная выстава дапамагае па-новаму ўбачыць унікальнасць айчыннай гісторыі і культуры, натхніцца беларускай архітэктурай і выбраць месцы для новых вандровак. **Адзін з аўтараў праекта, лаўрэат прэміі «За духоўнае адраджэнне» Алег ЛУКАШЭВІЧ** адзначае:

— Калі мы пачыналі наш праект у 2001 годзе, асноўнай задачай было паказаць разнастайную культурную спадчыну нашай краіны. Сведчаннем таго, што гэта работа аказалася запатрабаванай, стаў выпуск першага альбома «Спадчына Беларусі», які выйшаў у 2004 годзе і быў прададзены за месяц. Сёння, асэнсоўваючы дванаццаць гадоў, якія прайшлі з таго моманту, як мы пачыналі працаваць над праектам, мы з гонарам і годнасцю адзначаем, колькі было зроблена па аднаўленні, адраджэнні нашай спадчыны. Пятнаццаць гадоў таму не было ні ратушы ў Магілёве, ні ратушы ў Мінску, ні многіх іншых аб'ектаў. Адзін з яскравых прыкладаў такога аднаўлення — Нясвіжскі палацава-паркавы комплекс, які сёння наведвае амаль паўмільёна турыстаў. Гэта сведчыць пра тое, што менавіта адноўленыя помнікі запатрабаваныя беларусамі.

На выставе пад адкрытым небам прадстаўлена больш за 100 фотавыяў адноўленых каштоўнасцяў Беларусі. І гэта далёка не ўсё архітэктурнае багацце краіны...

**Ніна ШЧАРБАЧЭВІЧ.** *nina@zviazda.by*